***М. С. Язерская***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# МАСТАЦКІЯ ФУНКЦЫІ МАТЫВУ ВАНДРОЎКІ Ў ЧАСЕ Ў АПАВЯДАННІ “ВЯЧЭРА МАНЕКЕНАЎ” РАІСЫ БАРАВІКОВАЙ

Хранаопера – гэта адзін з падвідаў тэмпаральнай фантастыкі, у якім, у адрозненне ад іншых жанраў, падарожжы ў часе з’яўляюцца загадзя спланаваным працэсам. Менавіта такая вандроўка становіцца сюжэтаўтваральным элементам у апавяданні “Вячэра манекенаў” Раісы Баравіковай. Час тут яўна міфалагізаваны: галоўная гераіня Вольга трапляе ў мінулае, прычым становіцца сведкай таго, што адбывалася ў яе адсутнасць. Жанчына прыязджае ў родныя мясціны, адкуль сям’я з’ехала ў Чыкага пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Раптам Вольга чуе голас маці, якая пахавана ў ЗША. “«У мяне слыхавыя галюцынацыі, – зрабіла яна ашаламляльнае адкрыццё. – Як гэта я раней пра тое не падумала? Ёсць жа такі тэрмін у медыцыне. Мне гэта ўсё здаецца» [1, с. 24], – абнадзейвала сябе Вольга. Аднак маці адкрывае дачцэ таямніцу яе галюцынацыі: «Ты разумееш, у нашым доме спыніўся час, і ўсё пракручваецца і пракручваецца адна і тая вячэра. Бясконцая вячэра. <…> Падчас той Чарнобыльскай аварыі неба абрынулася на зямлю. Тут другі космас, а хто з жывых ведае, што робіцца ў космасе?»” [1, с. 24–25]. Жанчына, нібы гледзячы кінастужку, становіцца сведкай размовы маці і электрыка, бачыць, як бацька кінуў маці з-за таго, што яна хацела ўсынавіць дзіцяці, даведваецца, што ў бацькі народзіцца дзіця ад Любы – памочніцы, якая ездзіла з ім на гандаль у Польшчу. І гэтыя карцінкі паўтараюцца яшчэ раз і яшчэ. Урэшце Вольга разумее, пра якую вячэру казала маці і на якіх манекенаў яны былі падобныя.

Пісьменніца дэфармуе час адмысловым чынам – плоскасці дзвюх эпох перасякаюцца ў адным пункце. Злапомны вечар, што рэзка змяніў лёс галоўнай гераіні, усё паўтараецца і паўтараецца, нагадваючы “дзень сурка” і ўзмацняючы адчуванне безвыходнасці і тугі. Зразумеўшы першапрычыны таго, што здарылася ў яе сям’і і адначасова ўсвядоміўшы немагчымасць што-небудзь змяніць у мінулым, гераіня мяняецца ўнутрана і трансфармуе ўласную будучыню.

Такім чынам, у апавяданні “Вячэра манекенаў” Р. Баравіковай адмаўляецца так званы “эфект матылька”: мінулае не падлягае зменам нават пры ўмяшанні ў яго падарожнікаў у часе. Аднак вандроўка ў мінулае цягне за сабой унутраныя змены гераіні і мае перасцерагальную функцыю.

## Літаратура

1 Баравікова, Р. Вячэра манекенаў : апавяданні / Раіса Баравікова. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 186 с.